Д. Сазонава

ЛЕКСІЧНЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ ПРЫ ПЕРАКЛАДЗЕ ТВОРА “ПРЫГОДЫ ТОМА СОЕРА” М. ТВЭНА НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

На працягу апошніх гадоў у Беларусі адзначаецца ўздым у галіне мастацкага перакладу замежнай літаратуры. Істотная актывізацыя дадзенага кірунку патрабуе актуалізацыі як навуковай базы, так і практычнага інстру-

ментарыя, якія б дазволілі айчынным перакладчыкам адпавядаць усім найноўшым тэндэнцыям у галіне сусветнага перакладазнаўства.

Мэта даследавання заключаецца ў выяўленні адметнасцей лексічных трансфармацый пры перакладзе твора “Прыгоды Тома Соера” М. Твэна на беларускую мову з пункту гледжання адэкватнасці ўспрымання мастацкага тэксту чытачом. У якасці матэрыялу абраны арыгінал названага твора і яго пераклад на беларускую мову, выкананы беларускім пісьменнікам Я. Маўрам.

Пры аналізе тэкстаў былі адабраны 30 лексічных адзінак і вызначаны наступныя спосабы іх перадачы на беларускую мову:

- транслітарацыя – 5 %: напр., *Tom – Том*, *Sid – Сід*, *Mary – Мэры*;
- транскрыпцыя – 6 %: напр., *Becky Thatcher – Бэкі Тэчэр*, *Huckleberry Finn – Гекльберы Фін*;
- апушчэнне – 12 %: напр., *safe and sound – жывы*, *little by little – патроху*, *cheek to cheek – разам*;
- генералізацыя – 12 %: напр., *an India-rubber ball – гума*, *poor rags – лахманы*, *a ruin of drooping rags – шматкі*;
- сэнсавае развіццё, або мадуляцыя – 14 %: напр., *Pain-killer – болесупакойнік*, *eeling very melancholy – не знаходзячы ні ў чым уцехі*, *ut it is a pity – мне вельмі прыкра*;
- кантэкстуальная замена – 15 %: напр., *and so they shall – ну, вядома!*, *retchings followed – рабілася млосна*, *to keep a lookout for – сачыць*;
- лексічнае дабаўленне 16 %: напр., *he resisted – ён устрымаўся ад спакусы*, *he licked me – ён здорава пабіў мяне*, *credulous – лёгка верыць*;
- канкрэтызацыя значэнняў – 20 %: напр., *to bury it in awful places in their island where there’s ghosts and things to watch it – закапваюць у якім-небудзь страшным месцы, дзе іх пільнуюць здані, вядзьмаркі і ўсялякая чартаўня*.

Прыведзеныя прыклады сведчаць аб тым, што пры перакладзе Я. Маўр найбольш актыўна карыстаўся метадамі канкрэтызацыі і дабаўлення, каб максімальна адэкватна перадаць сэнсавае напаўненне і аўтэнтычнасць арыгінальнага твора.